М. БАНДАРЭНКА
бібліятэкар Мазырскай гарадской дзіцячай бібліятэкі мікраараёна "Маладзёжны"

# Блеф-гульня "Мядзведзяня Падынгтан у Мазыры. Нечаканае падарожжа"

## У межах інтэлектуальна-гульнявога праекта "Блеф-клуб"



*Удзельнікі:* вучні 2–5 класаў.

*Мэта:* выхоўваць любоў дзяцей да малой радзімы, пазнаёміць з беларускімі кнігамі, вучыць размаўляць на беларускай мове.

*Абсталяванне:* кніжная выстава "Беларуска-мазырскі алфавіт", жэтоны, эмблемы, таблічкі "веру" і "не веру", прэзентацыя.

### Ход мерапрыемства

**Бібліятэкар.** Добры дзень! Малая радзіма… Як вы разумееце гэтыя словы? Так называюць край, дзе вы нарадзіліся і жывеце. А што з'яўляецца малой радзімай для нас з вамі? (*Адказы дзяцей.*) Мазыр — наш куток роднай зямлі. Адчуваеце, як пяштотна і мілагучна гэта гучыць? Гэтак жа як самыя дарагія нам словы — мама, дом. (*Дзеці працягваюць называць дарагія ім словы на роднай мове.*) Мазыр — не проста кропка на карце. Гэта наша радзіма. Дарагая, родная, любая. І такая цудоўная!




Наш горад не падобны на іншыя, тут усё дыхае гісторыяй: кожны камень, дом, вуліца, помнік. А яго вулачкі то падымаюцца ўверх, то раптоўна апускаюцца ўніз. Усё гэта невыпадкова, бо Мазыр размешчаны на пагорках.

З якога б боку мы з вамі не пад'язджалі да яго, перад намі абавязкова паўстане маляўнічая панарама горада.

Гарады, як і людзі, непаўторныя. Кожны мае свой твар, свой лёс. Але калі чалавеку для таго, каб нарадзіцца, пасталець і састарыцца, дастаткова некалькі дзесяцігоддзяў, то ў горада гэта займае стагоддзі. Яго аблічча, непаўторнасць ствараюцца многімі пакаленнямі жыхароў, якія спачатку выбіраюць месца для закладкі-нараджэння горада, а затым на працягу ўсяго жыцця будуюць і перабудоўваюць свой горад.

Вы нават уявіць сабе не можаце, колькі ўсяго цікавага і неверагоднага хаваецца за гэтым словам — Мазыр. Хочаце даведацца? Смела падарожнічайце, у тым ліку і з кнігамі, і пазнавайце свой родны край!

*Хочаце верце, хочаце не, але вы ўсе сёння адправіцеся ў падарожжа па Мазыры разам з мядзведзянём Падынгтанам. Ведаеце гэтага персанажа?*




А як вы лічыце, якое стаўленне гэты мішка можа мець да нашага горада? (*Версіі дзяцей.*) Справа ў тым, што Падынгтан вельмі любіць усё новае і цікавае. Таму ён страшна ўзрадаваўся, калі яго сябар, смелы ваяка Мішка, прапанаваў яму з'ездзіць у Мазыр, паглядзець на неверагоднай прыгажосці горад. А вось ці ўзрадаваліся мазыране, якіх яму давялося сустрэць, гэта ўжо іншае пытанне. Таму што ў Падынгтана ні дня не праходзіць без прыгод.

Не ведаю, як вы ставіцеся да вандровак, але Падынгтан асабіста — вялікі іх аматар. Аднак, адпраўляючыся ў нечаканае падарожжа ў Мазыр, ён і ўявіць сабе не мог, у якую гісторыю трапіць. А ўсё таму, што ў яго не аказалася даведніка на беларускай мове. Але Падынгтан не прывык сумаваць. Ён не разгубіўся б нават у самай заблытанай сітуацыі. Такі ўжо гэта мядзведзь — дзе ён, там ніколі не бывае сумна. Не верыце? Глядзіце самі: у Мазыры ён правёў ужо некалькі тыдняў і за гэты час паспеў нядрэнна пазнаёміцца з нашым горадам. Падынгтан даведаўся, што на тэрыторыі нашага горада шмат унікальных храмаў, сабораў і цэркваў, нават ёсць свая Замкавая гара і непаўторны заказнік "Мазырскія яры". Аднак у яго яшчэ застаецца шмат пытанняў да нас, жыхароў, бо хто больш за нас можа ведаць аб любым куточку роднага краю?! Дапаможам Падынгтану разабрацца з тым, што яму незразумела? Тады будзем уважліва слухаць пытанні і старацца правільна адказваць.

Як бачыце, вы падзяліліся на каманды. Нам трэба выбраць капітанаў. Вы будзеце ўважліва прыслухоўвацца да меркавання членаў вашых каманд і ад імя ўсіх падымаць таблічкі "веру" ці "не веру" ў залежнасці ад таго, паверыце вы Падынгтану ці не.





## ПЕРШЫ ТУР

Ці верыце вы, што:

**1.** Як думаеце, колькі гадоў нашаму гораду? Дваццаць, пяцьдзясят, сто, пяцьсот, тысяча, а можа 864? Ці 1864?

Каб адказаць на гэта пытанне, трэба ўспомніць, у якім годзе быў заснаваны наш горад. Мішка Падынгтан упэўнены, што гэта адбылося не вельмі даўно — па казачным меркам, канешне. Ен называе 555 год. Згодны?

*Адказ.* Не, Мазыр быў заснаваны ў 1155, а значыць яму 864 гады. Ён старэйшы за вас, сябры, больш чым на 850 год!

Годам заснавання Мазыра з'яўляецца 1155 год. Летапіснае ўпамінанне аб ім утрымліваецца ў Іпацьеўскім спісе "Аповесці мінулых гадоў", дзе быў зроблены запіс аб тым, што вялікі кіеўскі князь Юрый Даўгарукі падарыў Мазыр і прылеглыя да яго землі чарнігаўскаму князю Святаславу. Гэта падзея і лягла ў аснову летазлічэння горада на правым беразе Прыпяці.

Падынгтан выдатна праводзіць час. Ён ужо і пастраляў у ціры, і на каруселі пакруціўся, і скаціўся з горкі... Праўда, пасля яго горка чамусьці стала ліпкай і ніхто больш не змог з'ехаць уніз. Няўжо гэта з-за булкі з мармеладам, якую заўсёды цягае з сабою адно запаслівае мядзведзяня? Але Падынгтану няма часу ў гэтым разбірацца, бо наперадзе яшчэ столькі забаў і прыгод!

**2.** Ці праўда, што на гербе горада Мазыра намалявана вавёрка? А можа кацяня? Ці арол?

*Адказ.* **Арол** увасабляе празорлівасць, розум, рашучасць, зоркасць.

**Сіні колер** сімвалізуе прыгажосць, веліч, водныя рэсурсы.

**Чорны колер** азначае пакору і разважлівасць.

Герб прысутнічае на ўсіх самых важных дакументах. Паглядзіце, які цудоўны і багаты наш герб! Не кожны горад мае такі прыгожы і адметны сімвал. Паспрабуйце дома намаляваць герб нашага горада.




*Падынгтан, як і ўсе мы, вельмі любіць хадзіць у розныя цікавыя месцы. Напрыклад, у лес. Толькі, зразумела, куды б Падынгтан ні пайшоў, там адразу пачынаюць адбывацца ўсялякія дзіўныя гісторыі, паўдзельнічаць у якіх могуць і вавёрка, і воўк, і лісічка, і нават — уявіце сабе! — дзік. Такі ўжо гэта мядзведзь — дзе ён, там ніколі не бывае сумна.*

Дык вось, Падынгтан некаторы час правёў у лесе і вельмі спадзяваўся сустрэць там мядзведзяў, зайсці да іх на гарбату, падзяліцца апошнімі навінамі. Як вы лічыце, чаму ў яго гэта не атрымалася? (*Мядзведзі яшчэ спяць.*). І, тым не менш, у Падынгтана ёсць для вас пытанне.

**3.** Кожны, мабыць, чуў, што мядзведзь смокча лапу ў сне. Ці праўда гэта?

***Адказ.*** На самай справе гэта няпраўда. Узімку, калі мядзведзь спіць, на пятках пад пластом агрубелай скуры працягвае расці новая. Старая скура лускаецца і моцна свярбіць. Таму мядзведзь аблізвае свае лапы і адрывае скарыначкі. Па вясне падэшвы лап мядзведзяў "упрыгожаны" лахманамі старой скуры. *Вучань зачытвае:* "Смактаць свае канечнасці могуць толькі мядзведзяняты, якія жывуць у няволі. Гэтым яны кампенсуюць недахоп матчыных дакрананняў".

Падынгтану заўсёды вельмі падабаліся паркі, сады, лясы. Ён быў на сёмым небе ад шчасця, калі звяры нашых лясоў дазволілі яму апрацоўваць у лесе невялікі зямельны ўчастак. Наш неўгамонны вандроўнік адразу пачаў разважаць, як яго ўладкаваць. Спачатку Падынгтан, як гэта з ім часта здаралася, трапіў у пераробку і ледзь не пазбавіўся сваёй каштоўнай банкі з мармеладам. Але потым юны мядзведзь-садоўнік атрымаў велізарную колькасць камплiментаў і глечык мёду за лепшы сад!

На пяты дзень свайго падарожжа Падынгтан з самага ранку адправіўся на прагулку. Раптам лінуў лівень, і яму давялося ратавацца ў кафэ. Там Падынгтану пашчасціла пачаставацца адной з любімых нашых страў –*дранікамі*. Вось толькі ён так і не здагадаўся, з чаго ж яны былі зроблены.

**4.** Ці верыце вы, што такія стравы, як дранікі, клёцкі, калдуны, робяць у нас з бульбы?

***Адказ.*** Так. Дранікі, напрыклад, гэта адна з найсмачнейшых нацыянальных страў Беларусі. Гатуюць дранікі з бульбы, якая таксама з'яўляецца сімвалам



нашай краіны. Бульбу беларусы паважліва называюць "другім хлебам", бо яна амаль штодня прысутнічае на нашых сталах. Яе вараць, смажаць, тушаць, робяць з яе клёцкі, калдуны, дранку і многае іншае.

Падынгтану дранікі вельмі спадабаліся! Цяпер ён упэўнены: калі загадаць жаданне, пакуль імі частуешся, яно абавязкова споўніцца. І Падынгтан пажадаў, каб дранікі былі кожны дзень!

Такі ўжо гэта мядзведзь — дзе ён, там ніколі не бывае сумна.

А якія яшчэ нацыянальныя стравы вам знаёмы? (*Адказы дзяцей.*)

**5.** Ці верыце вы, што Мазыр — адзінае месца, у якім прыродны запаведнік знаходзіцца прама ў горадзе?

***Адказ.*** Гэта так. Яго называюць "Мазырскія яры". Мазырская града — высокія пагоркі, якія мясцовыя жыхары называюць гарамі,— месца, зусім не характэрнае для Беларусі, і тым больш для Палесся.



Адпраўляючыся на экскурсію ў *Мазырскі замак*, Падынгтан спадзяваўся ўбачыць і даведацца шмат цікавага. Ён і падумаць не мог, што група турыстаў прыме яго за экскурсавода і завяжацца за ім па пятах. Каб пазбавіцца ад дакучлівага "хваста", Падынгтану прыйшлося праявіць цуды вынаходлівасці. Такі ўжо гэта мядзведзь — дзе ён, там ніколі не бывае сумна.

Увага! У Падынгтана пытанне:

**6.** Праўда ці не, што Мазырскі замак — цяпер ужо адзіны драўляны замак на тэрыторыі Беларусі і Расіі?



*Адказ.* Гэта так! І яго гісторыя магла б легчы ў аснову захапляльнага гістарычнага блокбастара. Мазырскі замак быў спалены ў 1649 годзе. Мазыр тады падтрымаў паўстаўшых казакоў Багдана Хмяльніцкага. Войскі літоўскага гетмана Януша Радзівіла пасля жорсткага бою ўзялі горад і спалілі крэпасць, у якой схаваліся паўстанцы і мясцовыя жыхары. З тых часоў сталіца Палесся не раз падымалася пасля пажараў і войнаў. Але крэпасць доўгі час не аднаўлялі.

Сваім адраджэннем Мазырскі замак абавязаны нашым сучаснікам, улюбёным у свой край і яго гісторыю. І вось у 2005 годзе, у год 850-гадовага юбілею Мазыра, над горадам зноў годна паднялі галовы драўляныя вежы.

**7.** Ці верыце вы, што самалёт МіГ-17 па вуліцы Інтэрнацыянальнай — сапраўдны і знаходзіцца там таму, што падчас палёту ў яго аднойчы скончылася паліва?

*Мядведзяня Падынгтан лічыць менавіта так! Ён аблюбаваў гэта месца і сур'ёзна думае над тым, каб заправіць самалёт і паляцець на ім дадому. Трэба пераканаць яго не рабіць глупстваў.*



*Адказ.* Не, гэта зусім не так! Гэта самалёт-помнік МіГ-17, які быў усталяваны на гарадскім узгорку па вуліцы Інтэрнацыянальнай у гонар гераічных подзвігаў лётчыкаў.

Залатымі літарамі ў гісторыю вызвалення Мазыра ўпісана імя капітана Канстанціна Захарава. Да моманту свайго апошняга подзвігу ён ужо ажыццявіў сто дзевяноста баявых вылетаў, правёў сорак адзін паветраны бой і збіў пятнаццаць варожых самалётаў. 13 студзеня 1944 года Канстанцін Захараў накіраваў палаючы самалёт у месца скаплення варожых войскаў. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.






**8.** Мядзведзяня Падынгтан цікавіцца, ці праўда тое, што з гліны можна зрабіць твор мастацтва? (*Гэта так.*)

А хто на такое здольны? (*Адказы дзяцей.*) Так, мастак-кераміст. І дзе ж Падынгтан мог убачыць у нашым горадзе вырабы з гліны?

*Адказ.* Шмат дзе, а асабліва ў музеі-майстэрні мастака-кераміста М. М. Пушкара. Музей дэманструе творчасць мастака, які, ствараючы народныя вобразы беларусаў-палешукоў, успрымаў навакольны свет гэтак ярка і самабытна, што быў сапраўды ўнікальным.

Сёння творчыя традыцыі, закладзеныя Мікалаем Пушкаром, працягваюць жыць і развівацца ў прадукцыі Мазырскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Яны вядомыя далёка за межамі нашай рэспублікі.

А вы ведаеце, дзе ў нас можна навучыцца працаваць з глінай? (*Адказы дзяцей.*)

А зараз запрашаю выйсці капітанаў каманд. За правільны адказ — 2 жэтоны. На гэты раз Падынгтан цікавіцца, што вы бачыце на гэтым фота.

*Адказ.* Гарадская дзіцячая бібліятэка мікрараёна "Маладзёжны".

## ДРУГІ ТУР

**Бібліятэкар.** З кнігай кожны з нас крочыць па жыцці з самога маленства. Пасябраваўшы з ёю яшчэ ў дзяцінстве, калі маці і тата чытаюць казкі перад сном, пасля мы проста ўжо не можам развітацца



з кнігай ніколі. Верыце? Вось убачыце! Кніга — гэта назаўжды, на ўсё жыццё! Мы так любім кнігі, што нас, беларусаў, прызналі адной з самых чытаючых нацый у свеце. Есць чым ганарыцца! Галоўнай кніжнай скарбніцай лічацца, канешне, бібліятэкі. У іх фондах знаходзіцца вельмі многа кніг, і кожны жыхар горада мае магчымасць выбрать менавіта тое, што ён пажадае.

*Увага, пытанне! Ці верыце вы, што ў Мазыры жывуць знакамітыя паэты і пісьменнікі?*



***Адказ.*** Гэта так. У розныя часы ў Мазыры жылі таленавітыя паэты і пісьменнікі, многіх з якіх добра ведаюць і шануюць. Давайце прачытаем творы некаторых з іх пра наш любы горад.

*Дзеці чытаюць вершы Анатоля Малюка, “бабы Галі” (Галіна Дзмітрыеўна Фядосенка), Анатоля Волкава, Аляксандра Каляды, Галіны Дашкевіч, Таццяны Дарошка, Васіля Андрыеўскага і іншых.*

**ТРЭЦІ ТУР**

***Жывёльны і раслінны свет***

“Дрэвы Мазыршчыны”

**Бібліятэкар.** А ці ведаеце вы дрэвы, якія можна сустрэць у нашых мясцінах? Мішка Падынгтан добра разбіраецца ў дрэвах, але цяпер яны стаяць без лісця, і іх так шмат, што без нашай дапамогі яму не абысціся. Зараз мы ўспомнім самыя знакамітыя з дрэў, якія сустракаем амаль што кожны дзень. Заданне наступнае: кожная каманда атрымае набор картак з выявай дрэва. Вам трэба будзе вызначыць, што гэта за дрэва. А потым праверым.



“Жывёльны свет”

**Бібліятэкар.** Здагадайцеся, пра якую жывёлу ідзе гаворка.

**1.** Гэты звярок цэлы дзень на нагах: бегае так хутка, што не заўсёды паспяваеш позіркам сачыць за ім. А яшчэ вельмі добра скача: лёгка можа сігануць з аднаго дрэва на другое, адлегласць паміж якімі 4–5 і нават больш метраў. Пры гэтым пушысты доўгі хвост гэтага звярка служыць яму сапраўдным рулём. А ў лютыя маразы хвост замяняе яму цёплую коўдру. Хоць зімою ў дупле звярку і так цёпла: дзеля гэтага восенню ён старанна затыкае мохам, лісцем і травой усе шчыліны. Не забывае і пра харчы на зіму, якія збірае некалькі месяцаў: і грыбы, і жалуды, і арэхі. (*Вавёрка.*)

**2.** У казках яго вельмі часта паказваюць няўклюдай і гультаём, але ён вельмі добра бегае (да 60 кіламетраў на гадзіну), умее плаваць, лазіць па дрэвах. Што найбольш здзіўляе ў ім і выклікае ўсмешку, дык гэта ягоная любоў да мёду. Натрапіць на вулей — нізавошта не адступіцца, пакуль мёду не паспытае, хоць часам пчолы яго могуць да паўсмерці пакусаць. (*Мядзведзь.*)

**3.** Гэты звер у казках падаецца нейкім дурнем. А між тым ён драпежнік і вельмі мала часу сядзіць на месцы (нездарма ж кажуць, што яго ногі кормяць). Ён разумны, хітры, кемлівы, назіральны і, калі трэба, асцярожны. Затое ў пагоні за сваёй ахвярай можа праявіць і хуткасць, і цягавітасць. У яго добры зрок і нюх, таму ахвяру ён можа ўбачыць на вялікай адлегласці і як след “абдумаць” план свайго нападзення. Ну, а хіба можа быць іншым гэты звер, змушаны ўсё жыццё сам сабе здабываць ежу?






Дарэчы, хоць ён і займеў рэпутацыю бязлітаснага драпежніка, які можа пагнацца за жывёлінай значна большай за яго, далёка не заўсёды гатовы ён рызыкаваць сваім жыццём, а толькі калі ўжо зусім дайме голад. Нярэдка шэры, як яго часта клічуць, перабіваецца ляснымі ягадамі ды ласуецца насякомымі і жабамі. (*Воўк.*)

**4.** Яго бачылі многія, але далёка не кожны адважыцца ўзяць гэтага маленькага звярка ў рукі: на спіне яго каля 16000 вострых іголак! (*Дзеці адказваюць хутка, без падказак.*)

Паслухайце яшчэ. Паспрабуй патрымаць яго, каб не пакалоцца: ён звернецца ў клубочак — ні носіка, ні лапак не відаць, адны іголкі! На выгляд ціхі і палахлівы, ён можа лёгка справіцца з жабамі, мышамі і нават змеямі, на якіх палюе ўночы (удзень яны звычайна спяць), часам дзеля гэтага праходзячы да трох кіламетраў. З позняй восені ў яго пачынаецца спячка. І спіць гэты звярок доўга — паўгода і нават больш, пакуль не прыйдзе сапраўднае цяпло. (*Вожык.*)

*Гуляючы ў лесе, Падынгтан знайшоў сабе новых сяброў. Хто яны, мы даведаемся, прачытаўшы эцюды з кнігі Алеся Бадака “Жывёлы. Заалагічныя эцюды”, глава: “Загадкавыя суседзі” (лось, рысь, дзік, ліса).*



**Бібліятэкар.** Сёння мы здзейснілі падарожжа па нашаму гораду, успомнілі выдатныя мясціны нашай роднай старонкі, дапамаглі Падынгтану ў гасцях адчуць сябе як дома, а таксама шмат цікавага даведацца пра Мазыр. Дзякуючы гэтаму ён вельмі палюбіў наш горад. Малайцы!

**Спіс крыніц**

1. Саўчук, С.С. Старажылы, волаты і монстры: для мал. шк. узросту / С.С. Саўчук, Л.У. Саўчук.— Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017.— 32 с.: іл.— (Самыя-самыя).

2. Чыстыя, глыбокія, прыгожыя... Азёры Беларусі: для мал. шк. ўзросту / склад. Т.І. Жукоўская.— Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017.— 32 с.: іл.— (Самыя-самыя).

3. Лябедзька, У.М. Пчолы-рэкардсмэны: для мал. шк. ўзросту / У.М. Лябедзька.— Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017.— 32 с.: іл.— (Самыя-самыя).

4. Ненадавец, А. Горад з легенды / А. Ненадавец // Вясёлка.— 1999.— № 5.— С. 4–5.

5. Коноплич, Н. 7 причин посетить Мозырщину / Н. Коноплич // Жыццё Палесся.— 2014.— № 107.— 13 сентября.— С. 6.

6. Мельченко, Е. Замковая гора: отсюда начинался Мозырь / Е. Мельченко // Жыццё Палесся.— 2014.— № 102.— 2 сентября.— С. 6.

7. Бобр, А. Память — это святое / А. Бобр // Жыццё Палесся.— 2008.— 18 красавіка.— С. 11.

8. Мінкевіч, Л.У. Мая Радзіма — Беларусь. Азбука сімвалаў краіны для дзяцей: для дашк. і мал. шк. узросту / Л.У. Мінкевіч.— Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016.— 32 с.: іл.— (Гэта наша з табою зямля).

9. Мінкевіч, Л.У. Мая Радзіма — Беларусь. Падарожжа па роднай краіне для дзяцей: для дашк. і мал. шк. ўзросту / Л.У. Мінкевіч.— Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016.— 40 с.: іл.— (Гэта наша з табою зямля).

10. Музей-майстэрня мастака-кераміста М.М. Пушкара [Электронный ресурс].— Режим доступа: https://ekskursii.by/by/?museum=102245_Museumworkshop_of_the_artistceramist_Pushkar, свободный (11.02.2019).— Загл. с экрана.

